Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
«Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі»

# Па вогненных вёсках

*Праект краязнаўчага маршрута №1*

Укладальнік – педагог дадатковай адукацыі Вайцяховіч А.В., кіраўнік аб’яднання па інтарэсах “Турызм”

Тут самыя чысцейшыя крыніцы,
Пясчаныя палі сярод лясоў.
Тут суджана было ім нарадзіцца
І бегчы з незапамятных часоў.

*Юрась Свірка.*

Докшыцкі раён размяшчаецца ў паўднёва-усходняй частцы Віцебскай вобласці. Яго плошча складае 2241 $км^2$. Маці-прырода шчодра адарыла сваімі багаццямі Докшыцкую зямлю. 46% тэрыторыі займаюць лясы. Бяруць пачатак і працякаюць рэкі Бярэзіна, Вілія, Поня і Сэрвач.

Але галоўнае багацце Докшыцкага краю – гэта гасцінныя, сумленныя, працавітыя людзі, якія зведалі нямала гора. Неаднойчы адбіваліся ад шведскіх, французскіх і нямецкіх заваёўнікаў.

Асабліва цяжкія выпрабаванні выпалі на долю жыхароў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Больш за 3,5 тысячы чалавек змагаліся ў радах Чырвонай Арміі, партызанскіх атрадах і падпольных групах. За час вайны Докшыччына страціла кожнага трэцяга жыхара, было спалена больш за 100 весак. Пяць Герояў Савецкага Саюза ўзрасціла гэта непакорная зямля.

Цяпер гэта квітнеючы край – край, дзе шануюць памяць сваіх землякоў, якія загінулі ў баях за Радзіму. Ганарацца і сваімі знакамітымі сучаснікамі, якія сумленнай працай памнажаюць славу роднага краю.

Багатая культурная, прыродная і гістарычная спадчына, старадаўнія паселішчы прыцягваюць сваёй непаўторнай прыгажосцю і велічнасцю. А аб тым, што наш край з глыбокай даўніны вабіў да сябе чалавека, сведчаць рассыпаныя па лясах і палетках шматлікія селішчы, гарадзішчы, могільнікі і курганы.

Арганізацыя паходаў дае магчымасць больш поўна знаёміцца з гісторыяй, прыродай, культурай нашага Докшыцкага краю. “Паходы па Докшыцкаму краю” – так называецца серыя метадычных рэкамендацый па арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенню паходаў і экскурсій. Да ўвагі педагогаў, класных кіраўнікоў, арганізатараў турысцка-краязнаўчай дзейнасці прапаноўваецца шэраг распрацаваных маршрутаў паходаў і экскурсій, разнастайны дадатковы матэрыял, які можна выкарыстоўваць пры знаёмстве і вывучэнні гісторыі, прыроды і культуры на адпаведнай нітцы маршрута.

## *Па вогненных вёсках*

### *Праект краязнаўчага маршрута*

Шмат гора прынесла Вялікая Айчынная вайна беларускаму народу. У Докшыцкім раёне за гады акупацыі было знішчана больш за 20 тысяч чалавек. Асабліва страшэнным стаў 1943 год. Менавіта ў гэты час былі спалены большасць населеных пунктаў у раёне. Тры вёскі пасля вайны так і не адрадзіліся. Па месцах гэтых спаленых вёсак і прапануецца здейсніць наш паход.

Турыстычны паход II ступені складанасці “Па вогненных вёсках” разлічаны на дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзроста і ставіць перад сабой мэту даследвання гераічных і трагічных падзей ваеннага ліхалецця, захавання памяці аб падзеях і выніках Вялікай Айчыннай вайны.

Адпраўным пунктам падарожжа з’яўляецца горад Докшыцы. Аднак вучні з сельскай мясцовасці могуць пачаць паход з бліжэйшага да іх школы пункта маршрута.

У час падарожжа турысты пройдуць і праедуць праз 19 спаленых у гады вайны населеных пунктаў. На месцах спаленых вёсак Шунеўка, Азарцы, Залатухі, а таксама каля помнікаў землякам, загінуўшым у гады нямецка-фашысцкай акупацыі, удзельнікі пахода могуць арганізаваць працоўны і экалагічны дэсант. Перад групай можна паставіць задачу сабраць больш матэрыялаў аб тых жудасных падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Для гэтага можна арганізаваць сустрэчы з мясцовымі жыхарамі.

Паход можна ажыццявіць як у летнія месяцы, так і на працягу ўсяго навучальнага года. Для гэтага прадугледжаны два варыянты начовак.

Функцыі экскурсавода або гіда можа выконваць не толькі кіраўнік групы, але і самі ўдзельнікі пахода. Для гэтага кіраўнік перад пачаткам падарожжа можа размеркаваць паміж турыстамі звесткі, якія знаходзяцца ў дадатку, або выкарыстаць матэрыялы з другіх крыніц.

# *Карта-схема маршрута*



# *Прыкладны парадак праходжання маршрута*

Наша падарожжа пачынаецца з горада Докшыцы.




У 8:10 аўтобусам “Докшыцы – Бягомль” група турыстаў выязжае да прыпынка мемарыяльны комплекс “Шунеўка”. Па шляху руху аўтобуса размяшчаюцца такія вёскі – як Янкі і Рашкаўка. У гады Вялікай Айчыннай вайны яны былі спалены немцамі.

У “Шунеўцы” можна зрабіць абзорную экскурсію і пазнаёміцца з трагічнымі старонкамі ў гісторыі вёскі.



Пасля заканчэння экскурсіі па мемарыяльнаму комплексу “Шунеўка” турысты па дарозе Докшыцы – Бягомль накіроўваюцца да вёскі Дабрунь, якая размешчана ў 0,5 кіламетры ад Шунеўкі. У гады вайны яе таксама напаткаў трагічны лёс. Зараз гэта невялічкая вёсачка, у якой пражываюць амаль адны старыя людзі. З вёскі Дабрунь ужо недалёка і да вёскі Пруднікі. Яна размяшчаецца на ўзвышшы сярод лесу ў кіламетры ад Дабруні. Каля будынка праўлення СВК “Прудніцкі”, злева ад дарогі на Докшыцы ў 1969 годзе ўстанавілі стэлу з барэльефнай выявай воіна і імёнамі 109 землякоў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Пруднікі, як Дабрунь і Шунеўка, таксама ўваходзяць у спіс “вогненных” вёсак раёна. Але ў цяперашні час ужо нічога не нагадвае ў ёй аб тых жудасных падзеях.



***в. Пруднікі***

Ад ПрудНікаў група павінна павярнуць на поўдзень і выйсці на дарогу, якая вядзе да вёскі Бярозкі. Праз 5 кіламетраў па гэтай лясной дарозе вам адкрыецца від на вёску Нябышына, якая размяшчаецца ў пойме ракі Поня на левым беразе. У гады вайны вёска была спалена немцамі. Пасля вайны яна адрадзілася, была нават школа. Але цяпер бачна, што вёска дажывае свой век.

З Нябышына група накіроўваецца ў вёску Вітунічы. Для гэтага ім трэба перайсці па масце праз раку Поня. На масце можна спыніцца, а кіраўнік за гэты час можа прачытаць турыстам два вершы пра Поню мясцовага паэта, ураджэнца вёскі Шклянцы Эдуарда Зубрыцкага. Праз два кіламетры ад маста турысты выходзяць на ўскраіне вёскі Вітунічы – цэнтр ДРУСГП “Вітунічы”.



Першае, што сустракае вас, прыгожы будынак сярэдняй школы, якая ўзведзена ў пачатку 90-х гадоў. У гэтай вёсцы можна зрабіць прыпынак да 14:40. За вольны час група можа зрабіць экскурсію па Вітунічах. Пабываць каля Брацкай магілы, дзе пахаваны 13 воінаў і 24 партызаны брыгады “Жалязняк”, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Каля будынка праўлення ДРУСП “Вітунічы” устаноўлена стэла ў памяць аб 124 аднавяскоўцах, якіх загубілі 30 мая 1943 года нямецка-фашысцкія захопнікі. Не лішнім будзе напомніць і пра тое, што у Вітунічах нарадзіўся вядомы беларускі пісьменнік Кірвель Анатоль Мяфодзьевіч (гл. дадатак).



*в. Вітунічы*

У 14:40 з Вітуніч адпраўляецца аўтобус “Докшыцы – Бярозкі”. На ім можна зрабіць аўтападарожжа па паўднёвай частцы Докшыцкага раёна. Вы праедзеце праз невялічкую вёску Шклянцы, дзе нарадзіліся і ўзгаданы вышэй Эдуард Зубрыцкі, і беларускія мастакі Міхаіл Фёдаравіч і Павел Федаравіч Барздыка. За час руху аўтобуса кіраўнік можна коратка расказаць іх біяграфіі.

У Бярозках аўтобус робіць прыпынак хвілін на 30-40. За гэты час група можа паглядзець помнік Герою Савецкага Саюза Чарныша Аляксандра Іванавіча, які знаходзіцца ў цэнтры вёскі каля будынка праўлення КУСГП імя Чарныша. На ўскраіне вёскі, каля могілак, знаходзіцца Брацкая магіла, у якой пахаваны 81 партызан брыгады “Жалязняк” і 6 воінаў Чырвонай Арміі, загінуўшых у гады вайны. Каб не вяртацца назад на прыпынак, папярэдне можна дамовіцца з вадзіцелем аўтобуса, каб ён спыніўся каля могілак і забраў групу.



*в. Бярозкі*

Наступныя 5 вёсак з 6 на шляху руху аўтобуса ў гады вайны былі спалены фашыстамі. Гэта – Чысці-Вардамскія, Чысці-Мільчанскія, Навасёлкі, Кемешаўцы і Мацееўцы. Цудам захавалася толькі вёска Дармантова. У цэнтры вёскі знаходзіцца помнік землякам, загінуўшым у гады фашысцкай акупацыі.

У Мацееўцах аўтападарожжа заканчваецца. Ад гэтай вёскі група павінна накіравацца на поўнач у накірунку да ракі Поня. Па грунтовай дарозе праз 2 кіламетры турысты павінны трапіць на жалезны мост (які ў народзе называецца “саламянскі”) праз Поню ў раёне вёскі Селішча. Ад гэтага месца існуюць два варыянты далейшага руху. Першы заключаецца ў тым, што ад маста можна адразу павярнуць у правы бок і прайсці праз невялічкі лес уніз па цячэнню ракі і выйсці праз 2 кіламетры да вёскі Буй. У вайну яна таксама была спалена.

Цікавасць гэтага шляху ў тым, што тут будуць сустракацца невялічкія меліяратыўныя каналы і ў вільготную пару неабходна будзе на некаторых участках арганізоўваць пераправу па бервяну. Такім чынам, можна праверыць турыстычную падрыхтоўку ўдзельнікаў паходу.

Для тых, хто не адважыцца прайсці такім маршрутам – існуе другі варыянт. Можна прайсці праз вёску Селішча, выйсці на дарогу і мінуўшы вёску Буй, трапіць адразу ў вёску Гняздзілава. Але гэта будзе даўжэй кіламетры на два.

Ракой Мараі вёска Гняздзілава аддзяляецца ад вёскі Верацейка, якую, дарэчы, таксама можна назваць сястрой Шунеўкі. Вось у гэтым месцы можна спыніцца на начоўку. Калі ж паход адбываецца ў дрэннае надвор’е, то можна пераначаваць у Гняздзілаўскай базавай школе.



***в. Гняздзілава***

Сама вёска Гняздзілава складаецца з некалькіх частак. На карце гэта добра бачна. Паўночная яе частка ў гады фашысцкай навалы была спалена гітлераўцамі. У цэнтры вёскі, насупраць клуба знаходзіцца помнік, які ўшаноўвае памяць землякоў, загінуўшых ў Вялікую Айчынную вайну. Адметнасцю гэтай мясцовасці з’яўляюцца рэшткі былой панскай сядзібы.

На наступны дзень у 7 гадзін раніцы група аўтобусам “Докшыцы – Куты” выязжае ў вёску Чырвонае Беразіно. Па дарозе турысты праедуць яшчэ праз адну “вогненную” вёску – Атрубак.



***Азарцы***

У Чырвонае Беразіно аўтобус прыбывае ў 7:35. Каля будынка мясцовага клуба знаходзіцца помнік 28 аднавяскоўцам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Ад вёскі Чырвонае Беразіно група накіроўваецца на паўночны захад і праз 1,5 кіламетра выходзіць на дарогу Докшыцы – Параф’янава. Праз 2-3 кіламетры ў заходнім накірунку ў чыстым полі злева ад дарогі турысты ўбачаць помнік на месцы былой вёскі Азарцы. На гэтым месцы неабходна пазнаёміцць удзельнікаў паходу з трагічным лёсам былой вёскі. Пасля гутаркі-знаёмства пажадана правесці работы па ўборцы і добраўпарадкаванню.

Аўтобусам “Докшыцы – Юркаўшчына” група ў 9:45 даязжае да канечнага прыпынку. У Юркаўшчыне, каля клуба размешчаны помнік, які ўшаноўвае памяць 5 землякоў, загінуўшых ў гады вайны. У канцы вёскі група павінна павярнуць на захад. Звілістай дарогай неабходна прайсці каля двух кіламетраў. Тут на ўскраіне лесу справа ад дарогі ў даваеныя часы знаходзілася вёска Залатухі. Цяпер аб трагічнай гісторыі былой вёскі нагадвае помнік. ***Папярэджанне:*** помнік з дарогі адразу цяжка заўважыць,

паколькі сам ён не высокі і знаходзіцца на адлегласці каля 300 метраў ад дарогі. Толькі алея з вялікіх ліп, мабыць, сведак тых страшных падзей, можа быць арыенцірам.

Пасля агляду помніка турысты зноў выходзяць на дарогу і праз 2-3 км трапляюць у вёску Вярэнькі і, пераходзячы праз чыгунку Полацк – Маладзечна, рухаюцца на ўсход у накірунку вёскі Хілаўшчына, да якой каля 2,5 кіламетраў. Ад яе да Параф’янава каля 5 кіламетраў. У Параф’янаве група павінна выйсці прама да касцёла Іаана Хрысціцеля. Каля яго можна зрабіць прывал да 13:30. За гэты час кіраўнік можа расказаць пра сам касцёл, пра вёску Параф’янава, пра Параф’янаўскі бой 1943 года, пра пісьменніка Лявона Гмырака і дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі Яна Бабровіча, ураджэнцаў гэтых мясцін. Калі будзе дазваляць час, можна зрабіць экскурсію па вёсцы і станцыі Параф’янава.



в.Сітцы



Да вёскі Сітцы група можа пад’ехаць у 13:30 на аўтобусе “Докшыцы – Гарадзішча”. У Сітцах турысты могуць паглядзець Свята-Георгіеўскую царкву; пабываць у парку каля рэштак былой панскай сядзібы і помніка землякам; пастаяць пад 500-гадовым дубам і прайсці пад брамай XVIII стагоддзя. Кіраўнік па ходу экскурсіі можа расказваць пра ўсе гэтыя памятныя мясціны, не выключаючы той факт, што ў гады вайны ў Сітцах быў ваенны нямецкі аэрадром і лагер для ваеннапалонных і мірных жыхароў.

Калі надвор’е неспрыяльнае, то можна застацца на начоўку у Сітцаўскай сярэдняй школе. Пры добрым надвор’і прапануецца зрабіць яшчэ 3-х кіламетровы пераход да ўрочышча Ходараўскі Лес. Гэта недалёка ад перакрыжавання дарог Сітцы – Порплішча і Дзядкі – Новая Вёска. Ва ўрочышчы знаходзіцца мемарыяльны комплекс “Ходараўка”.

У гэтым месцы ў чэрвені 1944 года нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі 200 італьянскіх ваеннапалонных і 600 мірных жыхароў Бешанковіцкага, Бягомльскага, Лепельскага і Ушацкага раёнаў.

м.к. “Ходараўка”

На ўскраіне лесу недалёка ад Новай Вёскі турысты могуць спыніцца на начоўку.



в. Порплішча

На наступны дзень група накіроўваецца ў вёску Порплішча міма “нежылой” вёскі Брычанькі. У Порплішчах можна спыніцца каля Спаса-Праабражэнскай царквы. Тут кіраўнік можа расказаць пра вёску, царкву, пра Парплішчанскі бой 1943 года, пра Героя Сацыялістычнай Працы Ірыну Пятроўну Камінскую-Курэц. Зусім побач ад царквы знаходзіцца помнік загінуўшым землякам.

На гэтым паход завяршаецца. У Докшыцы група

можа вярнуцца ў 13:15 аўтобусам “Глыбокае – Докшыцы”.

## *Графік руху*

| Дзень | Участкі пераходаў | Адлегласць км | Спосаб руху |
|---|---|---|---|
| **1** | г.Докшыцы - м.к. «Шунеўка» | 9 | аўтобус |
| | м.к. «Шунеўка» - в.Пруднікі | 3 | пешшу |
| | в.Пруднікі - в.Вітунічы | 7 | пешшу |
| | в.Вітунічы - в.Бярозкі | 10 | аўтобус |
| | в.Бярозкі - в.Мацееўцы | 14 | аўтобус |
| | в.Мацееўцы - в.Гняздзілава | 10 | пешшу |
| **2** | в.Гняздзілава - в.Ч.Беразіно | 9 | аўтобус |
| | в.Ч.Беразіно - в.Азарцы | 4 | пешшу |
| | в.Азарцы - в.Юркаўшчына | 11 | аўтобус |
| | в.Юркаўшчына - в.Вярэнькі | 4 | пешшу |
| | в.Вярэнькі - в.Параф'янава | 10 | пешшу |
| | в.Параф'янава - в.Сітцы | 4 | аўтобус |
| | в.Сітцы – ур.Ходараўскі Лес | 5 | пешшу |
| **3** | ур.Ходараўскі Лес - в.Порплішча | 7 | пешшу |
| | в.Порплішча - г.Докшыцы | 11 | аўтобус |

***Усяго актыўным спосабам – 50 км***

## *Спісак вёсак Докшыцкага раёна, спаленых у гады Вялікай Айчыннай вайны*

**Адноўленыя:**

1. Азерцы
2. Асецішча
3. Асінавік
4. Атруб
5. Атрубак
6. Атрубак (Бярэзінскі с/с)
7. Бабцы
8. Бедзіна
9. Беразіно
10. Бераснёўка
11. Бераспонне
12. Бірулі
13. Брадок
14. Будачы
15. Будзілаўка
16. Буй
17. Бяседа
18. Варлань
19. Верацеі
20. Верацейка
21. Вілейка
22. Вітунічы
23. Вольберавічы
24. Восава
25. Востраў
26. Вуглы
27. Вугольцы
28. Вускрам’е
29. Гарадзейка
30. Гарэлае
31. Гічанцы
32. Глінная
33. Гняздзілава Пн.
34. Дабрунь
35. Далёкае
36. Дамашкавічы
37. Дзедзіна
38. Доўгае
39. Дубраўка
40. Жамойск
41. Жураўлёва
42. Загалаўе
43. Зальхаўе
44. Залядзе
45. Замасточча
46. Замошша
47. Заполле
48. Зарачыцк
49. Кадлубишча
50. Кальнік
51. Капцюгі
52. Караліно
53. Кемешаўцы
54. Кляпіцы
55. Коўлі
56. Краснае
57. Ліпнікі
58. Лусцічы
59. Малажане
60. Мацеяўцы
61. Мількунь
62. Несцераўшчына
63. Нова-Вілейка
64. Нова-Вольберавічы
65. Нова-Запонне
66. Новасёлкі-Асінаўскія
67. Новасёлкі-Кемешаўскія
68. Нябышына
69. Парэчча
70. Пліскі
71. Прyднікі
72. Пугачова
73. Пустаселле
74. Пясчанка
75. Рачныя
76. Рашкаўка
77. Сасноўка
78. Слабада
79. Слабада
80. Старына
81. Сценка
82. Таргуны
83. Тумілавічы
84. Тураўшчына
85. Улессе
86. Федаркі
87. Хмялеўшчына
88. Цагельня
89. Чарніца-1
90. Чарніца-2
91. Чупры
92. Чысці-Вардамскія
93. Чысці-Мільчанскія
94. Шалагіры
95. Шалашы
96. Шніткі
97. Янкі

**Не адноўленыя:**

98. **Азарцы**
99. **Залатухі**
100. **Шунеўка**

# *Трагічныя старонкі спаленых вёсак*

## *Аперацыя “Котбус”*

З 20 мая па 21 чэрвеня 1943 года спецыяльнымі карнымі часцямі СС, жандармерыяй, ахоўнымі войскамі, паліцыяй з падтрымкай рэгулярных войск з танкамі, артылерыяй і авіяцыяй (усяго больш за 80 тысяч чалавек) немцы правялі карную аперацыю пад кодавай назвай “Котбус”. Яна праводзілася супраць партызан і мірнага насельніцтва ў Бягомльскім, Плешчаніцкім, Халопеніцкім раёнах Мінскай вобласці і Лепельскім раёне Віцебскай вобласці.

Карнікі з мэтай знішчэння акружылі ў раёне Домжарыцкіх і Паліцкіх балот партызан брыгады “Дзядзькі Колі”, “Жалязняк”, імя Кірава, але ў ноч на 19 чэрвеня партызаны выйшлі з блакады, і нямецкае камандаванне спыніла аперацыю.

У ходзе аперацыі немцы знішчылі каля 10 тысяч мясцовых жыхароў, спалілі дзесяткі вёсак, у тым ліку Ганцавічы (загубілі 145 чалавек), Іканы (550 чалавек), Новае Сяло (148 чалавек) Бягомльскага раёна, Засоўе (235 чалавек), Літвічы (118 чалавек) Плешчаніцкага раёна, у гарадскім пасёлку Бягомль забілі 300 чалавек. Акрамя таго, 6053 чалавекі былі вывезены ў Германію, захоплена 6500 галоў жывёлы, 684 тоны збожжа, 24 тоны бульбы і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў.

## *Залатухі*

Вёска Залатухі знаходзілася за 3 кіламетры на паўночны захад ад вёскі Вярэнькі. 20 сакавіка 1943 года нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яе разам з жыхарамі. Але па волі невядомых абставін Залатухі не трапілі ў чорны спіс вёсак, якіх знішчыла з твару зямлі полымя вайны. Хаця ў пуні, што стаяла на ўскраіне вёскі, згарэлі 43 чалавекі. Уратавалася жанчына з трымя дзяцьмі. Яе немцы з натоўпу выклікалі самі і адпусцілі – невядома з якіх меркаванняў. Наконт гэтага старыя людзі расказваюць рознае, але сапраўднай ісціны, канечне, не ведае ніхто. Яшчэ двое дзетак з вёскі былі ў гэты дзень у школе ў Вярэньках, а Марыя Адамовіч невядомым чынам выкацілася ўжо з палаючай пуні сама. У полымі засталіся яе чацвёра дзяцей і муж, самую маленькую трохгадовую дачушку ён трымаў на руках. Іх потым так дваіх і знайшлі. Харанілі згарэлых сяляне з суседняй вёскі Забегі. Сабралі ў прасціны ўсё, што засталося, і пахавалі ў агульнай магіле. А Марыя Адамовіч пасадзіла чатыры елачкі.

Родныя некаторых загінуўшых пазней стварылі імправізаваныя магілы, а потым у 1980 годзе на месцы спаленай вёскі быў пастаўлены агульны помнік усім ахвярам, якія прынялі пакутніцкую смерць, сталі заложнікамі вайны.

## *Азарцы*

Не менш трагічны лёс напаткаў і вёску Азарцы, якая знаходзілася за шэсць кіламетраў на захад ад горада Докшыцы, злева ад дарогі на чыгуначную станцыю Параф'янава. 12 жніўня 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты загубілі 27 жыхароў, з якіх 4 жывымі кінулі ў агонь. У 1979 годзе на месцы трагедыі быў пастаўлены помнік – скульптурная кампазіцыя: жанчына ў жалобе і хлопчык.

## *Шунеўка*

Гэта карная аперацыя не абмінула вёску Шунеўка. На досвітку 22 мая 1943 года фашысцкія захопнікі, акружыўшы вёску, сагналі яе жыхароў у адрыну і зажыва спалілі. У гэтай трагедыі загінулі 67 чалавек, з якіх 16 былі дзеці. Толькі траім пашчаслівілася ўцалець ад варожых куль, ад агню ў Шунеўцы. Адзінага дарослага ў тую пару сведкі – Канстанціна Ананіча – ужо няма ў жывых. Соні, якая выратавалася разам з бацькам, было гадоў шэсць, яе дваюраднаму брату Валодзю столькі ж. Але 22 мая яны запомнілі на ўсё жыццё, быццам гэта было ўчора. Бачылі і чулі, як гарэла Шунеўка, і жыхары навакольных вёсак. Старых фашысты палілі ў адрыне, а настаўніцу і дзяцей кідалі ў калодзеж. Па краях калодзежа людзі палажылі шэрыя камяні-валуны, як сімвал бязмернай жорсткасці фашызму. Побач – зламаны паветраны змей з імёнамі дзяцей, якому ўжо ніколі не ўзляцець у неба...

А вось як успамінае тую трагедыю Ілля Копыл, які нарадзіўся ў вёсцы Нябышына, і зараз пражывае ў горадзе Мінску: "Вясной 1943 года немцы акружылі і спалілі разам з жыхарамі вёску Шунеўка, якая была ў чатырох кіламетрах ад нашай вёскі. Я памятаю, што бацька быў крэпка незадаволены на гэты конт. Ён абвінавачваў у здзейсненым злачынстве партызан. А я і старэйшы брат здзіўляліся, гэта ж справа рук фашыстаў. А было так. Партызаны заселі каля вёскі. У 4 гадзіны раніцы яны абстралялі адзіночную нямецкую машыну. Нікога не забіўшы, яны на вачах у збянтэжаных немцаў уцяклі ў Шунеўку, дзе і схаваліся. Немцы былі ўпэўнены, што засада была арганізавана мясцовымі жыхарамі. Яны выклікалі з Докшыц дапамогу, і праз 25 хвілін вёска ўжо палыхала.

15 чэрвеня 1979 годзе адкрыўся мемарыяльны комплекс на месцы спаленай вёскі Шунеўка. У стварэнні мемарыяльнага комплексу прымалі ўдзел амаль усе працоўныя калектывы раёна, вучні школ. Шунеўка стала як бы агульным помнікам усім спаленым, растраляным і закатаваным.

У 1983 годзе на мемарыяльным комплексе ўстаноўлена скульптура "Праклён фашызму" (скульптар А.Анікейчык, архітэктары Л.Левін, Ю.Градаў; бронза, граніт; вышыня фігуры 4,75 м, агульная вышыня 11,5 м.) архітэктурна-скульптурны ансамбль складаецца з цэнтральнага манумента – фігуры жанчыны, 22 мемарыяльных знакаў – фундаментаў на месцы былых сялянскіх сядзіб і калодзежа, у які фашысты кінулі жывымі 16 дзяцей. Цэнтральны манумент – бронзавая фігура жанчыны, якая стаіцьу праёме

брамы смутку з узнятымі ў праклёне рукамі. На абламаным канцы гарызантальнай бэлькі брамы прымацаваны 3 званы 18 стагоддзя са спаленых цэркваў.
Два з іх звоняць, трэці расколаты – сімвал таго, што кожны трэці жыхар раёна загінуў у Вялікую Айчынную вайну. Побач са званамі высечаны верш Р.Барадуліна:

« Як маці заклінаю і малю –
наступных пакаленняў дзеці,
Сейце
Бяссмерця зерне ў вечную раллю!
Праклён вайне,
Што сее смерць на свеце!»

Непадалёку ад цэнтральнага манумента бетонны зруб калодзежа. Над ім нібыта падае бронзавы прабіты і абпалены паветраны змей, як разбітая дзіцячая мара. На змеі выбіты імёны 16 загубленых дзяцей. Над фундаментам-знакам кожнай хаты завісае ганак, на якім устаноўлены бронзавы факел з імем былога гаспадара.

Архітэктурна-скульптурныя збудаванні добра суадносяцца з ландшафтам, векавымі дрэвамі – сведкамі трагедыі, што тут адбылася.

## *Нябышына*

***(З успамінаў Іллі Копыла)***

Мы, жыхары вёскі Нябышына, называлі аперацыю “Котбус” першай нямецкай блакадай. Яна пачалася ў сярэдзіне мая 1943 года. Аб яе пачатку партызаны нам не паведалі. Аднак мы паспелі ўцячы з вёскі ў Лабоцкія балоты ўсяго за некалькі гадзін да прыходу немцаў. Невялікімі групамі па тры-чатыры сям’і кожны дзень мянялі месцы начовак. А над лесам увесь час кружыў разведвальны нямецкі самалёт “рама”.

Аднойчы мы толькі пакінулі сваё месца і адыйшлі метраў на трыста, як у наш шалаш папала бомба. Я заплакаў, так як у шалашы была мая губная гармоніка.

У вёсцы засталіся толькі старыя і хворыя. Усіх іх (а гэта чалавек 10-15) паліцаі расстралялі і спалілі ў хлеве. Потым немцы падпалілі 6 хат, у там ліку і нашу.

## *Вітунічы*

***(па успамінах Бобрыка Пятра Дзянісавіча)***

Страшныя падзеі 30 мая 1943 года ў Вітунічах помняць нямногія. Тыя, хто па шчаслівым выпадку ўцалелі... Сярод іх – былы настаўнік Вітуніцкай сярэдняй школы Бобрык П.Д., у той час звычайны вясковы падлетак.

... Нядзеля. Каторы тыдзень па ўсёй Бягомльшчыне жудасная блакада. Праўда, асноўныя баі з партызанамі перамясціліся за раку Бярозу. А тут

пацішэла. Пранясецца праз вёску з Докшыц на Бягомль нямецкая машына – і зноў ахопіць вяскоўцаў непакой: а што будзе далей?

- Нядзеля – дзень не рабочы. І мы, вясковыя падшыванцы, - успамінае Пётр Дзянісавіч, - коней павялі на выпас. На лясной лугавіне, у Барсуках, што між Старым Запоннем і Глінішчамі, кожны спутаў свайго каня. Коні ўзяліся скубсці, а мы – гуляць.

... У самы разгар гульні недзе між Нябышынам і Вітунічамі раздаўся моцны грукат. Усе прыціхлі, гульня перарвалася. Чакалі новых выбухаў. Іх не было.

Сонца бралася пад поўдзень. Пара і абедаць. Некаторыя з падлеткаў бралі лусты з сабой, некаторыя ехалі абедаць дадому. Пятро Бобрык разам з сябрам Вінцэсем Катэкам выехалі з лесу ў Дворышчах, па дарозе з Запоння. Спыніліся. Цішыня над вёскай: ні сабак, ні пеўняў не чуваць.

У сяле з кожнага акна выглядаюць спужаныя людзі.

- На падворку чакала мяне бабуля і маці, - працягвае сведка той трагедыі. – На тварах – выраз няпэўнасці. У нейкіх пасцілках звязаны нейкія рэчы, відаць, каб у патрэбным выпадку выхапіць з хаты самае неабходнае.

Абедалі моўчкі. Каб парушыць цішыню, хлопец пытае ў маці пра той грукат, што так напалохаў пастушкоў. Аказваецца, нехта бачыў, што на грэблі за вёскай нямецкая легкавушка падарвалася.

... З боку Бягомля пачуўся гул машын. Усё мацней і мацней... Усё бліжэй і бліжэй... Доўгі грузавік з высокімі бартамі. Адзін пры адным стаяць з двух бакоў вайскоўцы ў зялёным, на галовах каскі. У адной руцэ вінтоўка, другой трымаюцца за борт. На кабіне кулямёт.

У момант усе пакінулі хату. І на звязаныя клункі забыліся.

Недзе каля магазіна грымнуў першы стрэл. А на другім канцы вёскі засакатаў кулямёт.

- Не помню, як апынуўся на кабыле, і чамусьці не галопам, а павольнай хадою выправіўся на загуменную дарожку. Азірнуўся: там і тут ва ўсю моц шугае агонь, а чорны дым не падымаўся ўгару: парывы рэзкага ветру з поўдня слалі дым уздоўж вуліцы, - расказвае Пётр Бобрык. Па дарозе на Глінішчы пачуў, як заціўкалі кулі над галавой. Скуліўся ў прыдарожную канаву. Клікаў за сабой кабылу – не паслухалася, завярнула ў вёску, якраз пад варожую кулю...

Неяк ціха і хутка дагарала сяло. Мёртвыя замоўклі навечна, жывыя, хто здолеў схавацца, маўчалі са страху. І стала зусім невыносна жудасна, калі адвячоркам з поля вярнулася скаціна: каровы такі ўзнялі рык каля сваіх папялішчаў, што, казалі, у другіх вёсках было чуваць. Нібы і скаціна аплаквала сваіх палеглых гаспадынь.

Тыя нямногія, што засталіся жывымі, дацямна не асмельваліся пакінуць сховішчы.

А потым (толькі наступнай раніцай) сталі лічыць і жыццё, і страты. Апошніх было намнога больш... З блізкага лесу выходзілі на ўскраіну, чуйна ўглядаліся, услухоўваліся, ці не грымяць маторы з-пад Асінавіка, з-пад

Нябышына. Перш, чым наблізіцца да вёскі, намячалі шляхі адыходу зноў у ратавальны лес.

Увесь наступны дзень быў прысвечаны пошуку сваіх, палілі ўсё ж карнікі не ў кожнай хаце. Па кавалках абгарэлай вопраткі пазнавалі блізкіх. Асцярожна складалі на пасцілку. Хавалі тут жа, недалёка, хто на ўзбочыне, хто на падворку.

... А зязюлі ў гэтыя дні кукавалі, як ніколі пасля. Здаецца, з усяго лесу зляцеліся ў абгарэлыя сады, і, віснучы на закапцелых галінках, так ужо кукавалі, як быццам і яны адчулі невыказны боль роднай зямлі.

А людзі не плакалі, як акамянелыя сэрцы ў непапраўным горы. У адзін дзень было расстраляна і спалена больш за 120 дзяцей і дарослых. Колькі ўзарвалася немцаў у той легкавушцы – і дагэтуль невядома. Надта ўжо неадэкватная цана была выстаўлена ў той недарэчнай партызанскай схватцы з гітлераўцамі.

За некалькі гадзін вёска была знішчана дашчэнту. Полымя праглынула больш за паўсотню хат з надворнымі будынкамі. Са значных пабудоў згарэлі панскі дом за сучасным возерам, дзе быў размешчаны дзіцячы садок, будынак сельсавета, амбулаторыя, аптэка, пошта, два магазіны, будынак старой царкоўна-прыходскай школы. Засталіся царква і каменны будынак новай сярэдняй школы.

# *Старонкі ваеннай гісторыі*

## *Параф'янаўскі бой*

На станцыі Параф'янава да пачатку лютага фашысты сабралі вялікую колькасць сена, збожжа, лесаматэрыялаў. Памяшканні гарнізона (каля 130 гітлераўцаў маршавых падраздзяленняў вермахта) былі агароджаны дротам, подступы ахоўвалі 3 агнявыя кропкі. У ноч на 18 лютага 1943 года партызанскія атрады брыгады "Жалязняк", каб адцягнуць увагу ворага, абстралялі казармы і ўмацаванні суседняга гарнізона ў горадзе Докшыцы, потым нанеслі ўдары па станцыі. У выніку бою партызаны разбурылі будынак вакзала, станцыйную гаспадарку, спалілі 3 склады са збожжам і сенам, лесапільны завод, пашкодзілі вадакачку і 5 кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі.

## *Сітцаўскі ваенны аэрадром і лагер для ваеннапалонных і мясцовых жыхароў.*

***(успаміны жыхаркі в. Парэчча Шылько Алены Антонаўны)***

Каб вам стала больш зразумела, хачу зрабіць кароткае адступленне. У ваенныя гады (ды і пасля) адрэзак дарогі ад цэнтральнай сядзібы саўгаса "Сітцы" да аднайменнай вёскі пуставаў. Направа распрасціралася далёка пад лес роўнае поле. Дакладней не поле, а аэрадром, пабудаваны ў 1939 годзе,

пасля ўз'яднання Беларусі. Гэты аэрадром немцы пачалі актыўна выкарыстоўваць у канцы 1943 года. За сядзібай, каля заросшага става, размясціліся доўгія нізкія баракі, абнесеныя калючым дротам у два чалавечыя росты, з вартавымі вышкамі. На аэрадроме і ў суседнім лесе, што быў літаральна перапоўнены штабелямі авіябомб, працавалі ваеннапалонныя, якія жылі ў лагеры.

Дык вось, у час нямецкай акупацыі ўсе, каму споўнілася 15 год, павінны былі хадзіць на работу. Я з сястрой кожны дзень хадзілі ў вёску Сітцы на розныя работы. Аднойчы каля вёскі Курдзекі ўзарваліся на міне 2 коней. Паколькі наша вёска межавала з партызанскай зонай, немцы вырашылі нас пакараць.

29 красавіка 1944 года яны акружылі нашу вёску і ўсіх мужчын забралі з сабой. Каля Курдзек загадалі ім капаць яму. Потым па 2 чалавекі ставілі каля ямы і расстрэльвалі. Так забілі 8 чалавек – 6 мясцовых жыхароў і 2 бежанцаў, якія былі прывезены ў нашу вёску.

5 мая 1944 года немцы зноў акружылі нашу вёску і усіх жыхароў пагналі ў вёску Сітцы і размясцілі ў лагеры, які быў размешчаны побач з былым панскім маёнткам. Лагер быў абнесены калючым дротам у некалькі радоў. Калі нас пагналі з роднай вёскі, Парэчча адразу падпалілі.

У лагеры ўсіх працаздольных забіралі на розныя работы. Над кожным стаяў надзірацель, ахоўвалі нас моцна. Кармілі нас 1 раз у дзень. Потым людзі сталі хварэць на тыф. Адзін дзяцёнак памёр. Яшчэ адна жанчына з малым дзіцём з Будслава захварэла. За ёй прыехаў бацька і на каленях прасіў немцаў аддаць хворую дачку і ўнука. Аддалі, але ні дачка, ні ўнук не выжылі.

У лагеры мы знаходзіліся да канца мая. Калі нас выпусцілі, то вяртацца не было куды. Мы жылі ў суседняй вёсцы Вайтовічы, а знаёмыя з суседніх вёсак давалі нам прадукты харчавання.

## *Ходараўская трагедыя*

***(успаміны сведкі тых падзей, жыхара в. Дзядкі Божалкі Вітольда Станіслававіча)***

У тую сонечную раніцу, 27 чэрвеня 1944 года, усе ў Дзядках пачулі перастук гарматнай кананады. Увесь гарызонт на ўсходзе быццам бы ўздрыгваў ад частых тугіх удараў. А тым, што ў немцаў справы дрэнь, сведчыў і такі факт. Аэрадромная служба ў Сітцах пачала ўзрываць узлётна-пасадачныя палосы, аэрадромныя збудаванні, склады. У нас, у Дзядках, ад аглушальных выбухаў павыляталі ва ўсіх хатах шыбы. Усё, што магло гарэць, было спалена і ў Сітцах, і ў Параф'янаве. Па палявой дарозе з боку Порплішча ў напрамку на Заборцы ехалі падводы – гэта ўцякалі на захад сем'і паліцаяў і іншых прыслушнікаў немцаў. "Мужыкі!" – устрывожана загаварылі дзядкоўскія жанчыны,- "Бярыце коней і ўцякайце ў лес, у кусты. А то немцы пахапаюць конікаў і саміх вас. А як жа мы тады жыць будзем?" Бацька мой быў ужо ў гадах, таму ён рашыў з вёскі нікуды не ісці. "Што будзе, то будзе," – сказаў ён рашуча. – "А ты, сынок, бяры каня і едзь у

ельнік пад Ходараўку. Баюся я за цябе, ды і каня шкада". Апаска бацькі была недарэмнай. Мне тады споўнілася 16 гадоў. А такія маладыя хлопцы патрэбны былі для работы. І вось мы, моладзь і некалькі старых сялян – у ельніку. Трымаем у руках павады, коні пашчыпваюць рэдкую асаку і зайцаву капусту, пафыркваючы і адбіваючыся ад насядаўшых мух, сляпнёў і аваднёў. Раптам, нібы кашлянуўшы і папярхнуўшыся закукавала зязюля. Мірная карціна цёплага чэрвеньскага дня была падманлівай. Яна таіла ў сабе небяспеку. Смерць падсцерагала тады не толькі тых, хто са зброяй у руках ішоў партызанскай сцежкай, ці франтавымі дарогамі...

Разважанні перарвалі доўгія аўтаматныя і кулямётныя чэргі, раскацістыя выбухі гранат. Мы ўсе ўздрыгануліся. Ускінулі галовы і нервова павялі чуйнымі насамі коні. Быццам падавіўшыся ўласным голасам, змоўкла зязюля. Рэха з вібруючым шалясценнем змоўкла ў гушчары, каб праз імгненне зноў адазвацца на новыя чэргі і выбухі. Стралялі дзесьці паблізу з боку вёскі Вялікія Сітцы.

Прывязаўшы коней да дрэў, мы асцярожна выйшлі на ўзлесак. Адгэтуль, з высокага месца, добра праглядалася прастора, абмежаваная справа ваколіцай вёскі Дзядкі, злева – дарогай на Новую Вёску і абшарам жытнёвага поля, якое распасціралася ўздоўж яе. Астраўком сярод поля зелянела дробналессе, злева ад якога быў хутар Плюта Івана, а з боку Вялікіх Сітцаў – хутар Кучыца Аляксандра.

Сумненняў больш не заставалася: там, сярод гэтых зараснікаў, адбывалася нешта жудаснае. Нечакана з кустоў з боку поля выйшаў мужчына і, апасліва азіраючыся, падыйшоў да нас. Мы пазналі ў ім Пятра Скрабнеўскага. "Там немцы нейкіх людзей забіваюць," – узбуджана, прыглушаным голасам прагаварыў ён, - "Я каля свайго хутара хаваўся з конем у лазняку. Калі пачалася стральба, папоўз па жыце і прыкладна на адлегласці ў 100 метраў некалькі хвілін назіраў. Яны падганяюць да ямы людзей, загадваюць раздзецца да споднягa і страляюць, а потым кідаюць у яму гранаты... Глядзіце, вунь па дарозе гоняць яшчэ групу..." Мы ўсе павярнулі галовы ўбок Новай Вёскі, адкуль да Ходараўкі канваіры з сабакамі гналі вялікую групу людзей. На перакрыжаванні калона павярнулася ўлева і накіравалася туды, дзе ўсё яшчэ раздаваліся кароткія чэргі, адзіночныя выстралы, разрывы гранат. Каб лепш было бачна, я і некалькі маіх аднагодкаў залезлі на дрэвы і адтуль доўга назіралі, як немцы гналі да страшнага месца новых людзей. Некаторых, бачна, аслабеўшых ад голаду і пабояў, палонных немцы везлі на грузавіках. Назад у гэтых грузавіках ехалі толькі канваіры...

Да самага вечара былі чуваць страляніна і выбухі, крыкі і стоны людзей. На наступны дзень стральба працягвалася.

2 ліпеня, калі ўжо прыйшла Чырвоная Армія, мы пабеглі ў той жудасны лясок. Вачам адкрылася страшная карціна. У розных кутках дробналесся жаўцелі свежай сырой глінай і пяском, закіданыя наспех голлем, 5 ям памерам прыкладна 3×4 метры. Забойцы так спяшаліся, што не засыпалі, як

трэба, сваіх ахвяр. З пяску і гліны выступалі рукі і ногі. Зямля, якой былі прысыпаны забітыя, наскрозь прапіталася крывёй. Засохшая кроў бурымі пятнамі віднелася на траве.

Людзі расказвалі потым, што забойцы ў зялёнай форме некалькі разоў на працягу гэтых 2 дзён прыходзілі на хутар Кучыца Аляксандра змываць з сябе людскую кроў і "запраўляцца" гарэлкай.

На ўзлеску мы выявілі вогнішча. Тут валяліся абгарэлыя рэшткі чамаданаў, абутку, вопраткі і іншых рэчаў. Доўгі час, усё лета, ад напоўненых трупамі ям распаўсюджваўся ўдушлівы пах.

## *На чыгунцы каля Порплішча.*

***(З успамінаў Нікадзіма Васільевіча Таляронка, які нарадзіўся ў вёсцы Малажане Докшыцкага раёна ў 1921 годзе)***

На чыгуначным пераездзе каля Порплішч і ў навакольных вёсках ва ўмацаваных збудаваннях (мы іх называлі бункерамі) фашысты трымалі даволі моцны гарнізон, які быў прызначаны для аховы чыгункі ад народных мсціўцаў. Мы вырашылі разграміць яго.

Аперацыя была дэталёва прадумана. Намецілі яе на ноч з 14 на 15 лістапада 1943 года. Па плану мы адначасова павінны былі напасці на нямецкую казарму, а таксама бункер у вёсцы Валодзькі, узарваць два чыгуначныя масты на бальшаку каля вёсак Барсукі і Казлы.

Прадуманы план даў добрыя вынікі. Мне давялося наступаць на бункер каля Порплішч. У гэтым умацаваным збудаванні знаходзілася, як мы даведаліся пазней 17 чалавек. Падкраўшыся да бункера, мы закідалі ў дымаход гранаты. Толькі афіцэр, які спаў асобна ад радавых, сумеў аказаць невялікае супраціўленне. Ён паспеў выстраліць з маўзера і выкінуць праз акно дзве гранаты.

Адначасова была разгромлена казарма ў Порплішчах, у якой знаходзілася 10 фашыстаў, узарваны чыгуначныя масты і масты на бальшаку. А вось бункер у Валодзьках знішчыць не ўдалося. Там павінны былі стаяць у каравуле ўкраінскія паліцаі, якія ведалі пра аперацыю, але ў апошні момант нямецкі афіцэр замяніў іх на сваіх салдат. Таму і сустрэлі нашых партызан агнём. Давялося адступіць – добра, што без страт.

Нягледзячы на гэту няўдачу, агульныя трафеі былі нядрэнныя – 2 кулямёты, 30 вінтовак, 2 мінамёты, вялікая колькасць патронаў, мін і гранат, шмат адзення, якое было нарабавана ў насельніцтва, а таксама прадуктаў. Усяго мы нагрузілі 30 павозак. Памяшканне бункера і казармы разам з трупамі забітых немцаў спалілі.

# *Помнікі Вялікай Айчыннай вайны па нітцы маршрута*

## в. Бярозкі

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан**

На ўскраіне вёскі, за 20 м ад могілак пахаваны 81 партызан брыгады “Жалязняк” і 6 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У 1964 годзе на магіле пастаўлены абеліск.

**Помнік Чарнышу Аляксандру Іванавічу**

У цэнтры вёскі, каля будынка канторы саўгаса імя А.І.Чарныша. Бюст Героя Савецкага Саюза А.І.Чарныша ўстаноўлены ў 1980 годзе.

## в. Вітунічы

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан**

На ўсходняй ускраіне вёскі, за 100 м ад могілак. Пахаваны 13 воінаў і 24 партызаны брыгады “Жалязняк”, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.

У 1964 годзе на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна.

**Помнік ахвярам фашызму**

У цэнтры вёскі, перад будынкам канторы саўгаса “Вітунічы”. На ўшанаванне памяці 124 аднавяскоўцаў, загубленных 30 мая 1943 года нямецка-фашысцкімі акупантамі, у 1967 годзе пастаўлена стэла.

## в. Гняздзілава

**Помнік землякам**

У цэнтры вёскі, насупраць клуба. На ўшанаванне памяці 61 земляка – воіна і партызана, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 годзе пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам.

## ст. Параф’янава

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан**

У скверы, каля чыгуначнага вакзала.

Пахаваны 55 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Сярод пахаваных – воіны 1193-га стралковага палка 860-й стралковай дывізіі, загінуўшыя ў 1944 годзе. У 1961 годзе на магіле пастаўлены помнік-скульптура воіна.

## в. Порплішча

**Помнік загінуўшым воінам-землякам**

Знаходзіцца каля будынка сельсавета, насупраць канторы племзавода “Порплішча”. Помнік быў пастаўлены ў 1971 годзе на сродкі мясцовага сельскага Савета ў памяць аб загінуўшых земляках у гады Вялікай Айчыннай вайны. У 60-я гады астанкі воінаў былі перавезены ў Докшыцы і перазахаронены ў брацкай магіле на плошчы Палявога.

## в. Прудзікі

**Помнік землякам**

Каля будынка праўлення калгаса, злева ад дарогі на Докшыцы. На ўшанаванне памяці 109 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

У 1967 годзе пастаўлена стэла з барэльефнай выявай воіна і імёнамі загінуўшых.

## в. Сітцы

**Помнік землякам**

Каля будынка канторы саўгаса “Сітцы”, у парку. На ўшанаванне памяці 30 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 годзе пастаўлены помнік – скульптура воіна.

**Помнік землякам**

Каля будынка сельскага савета.

На ўшанаванне памяці землякоў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны ў 1989 годзе пастаўлены помнік  (скульптар А.Тухто).

## пас. Чырвонае Беразіно

**Помнік землякам**

У цэнтры вёскі, перад будынкам клуба. На ўшанаванне памяці 28 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1968 годзе пастаўлены помнік – трохметровы слуп з 5 жалезабетонных блокаў. На сярэднім, ссунутым адносна вертыкальнай восі, - надпіс-прысвячэнне і імёны загінуўшых. На гранях верхняга блока рэльефныя выявы на тэмы ўсенароднай барацьбы народа супраць ворага.

# *Паэтычныя творы*

**Балада пра Шунеўку**

Шукаю ў даведніку вёску,
Шукаю-гукаю лясную.
Ніякіх няма адгалоскаў
Шкадую, бядую, смуткую.
І зноў шукаю-гукаю.
Няўжо аніякага следу?
Вазьму ды Хатынь запытаю,
Яна не адмовіць паведаць,
Нагадваю ёй: за Бягомлем
Шунеўка не гібела,
Хатынь адгукнулася болем –
Званоў памінальных боем:
“Яна, як і Я – зга-рэ-ла,
Сястрыца мая – зга-рэ-ла”.

**Юрась Свірка**

**Шуневцам**

Мы снова с вами, наши земляки,
Мы – с вами, дети, матери и деды.
Вы – мужества и веры маяки,
Отдавшие всю жизнь за День Победы.
    Цветущим маем, сорок лет назад,
    Согнали вас и заперли в сарае…
    И в ярости носился злобный кат,
    Всё на пути своём огнём сметая.
Безжалостной рукою палача
В колодец брошен был грудной ребёнок,
И, как солдат, здесь падал от меча
Мечтающий о подвиге орлёнок.
    Стонала обожжённая земля,
    Стонали люди, пламенем объяты…
    И крики: «Мама! Мамочка моя!»
    Нам слышались в салюте в сорок пятом.
На вас обрушен был фашистский смерч,
Но в памяти народной вы нетленны.
Мы знаем твёрдо: вы пошли на смерть
За правду и за мир во всей Вселенной.
    За то, чтобы росли вокруг леса,
    Наполненные только птичьим свистом,
    Чтоб ранней зорькой рушилась роса
    Героем поля – ратным трактористом.

Чтоб колосились добрые хлеба,
Чтобы любовь была и были дети,
За то, чтобы счастливая судьба
Не обошла людей на всей планете.
На этой окровавленной земле
Клянёмся вам, родные наши люди,
Что не уйдёте вы в небытие,
Что память вас хранить веками будет.

**Марксіна Фабрычніна**
(партызанскае імя – Валянціна).
*Партызанка брыгады "Жалязняк", прымала ўдзел у адкрыцці мемарыялу ў спаленай фашыстамі Шунеўцы. Гэтай падзеі прысвечаны верш.*

## Шуневский мемориал

В районе нашем каждый третий пал,
Не отзовётся он и не ответит…
Мы открываем здесь мемориал,
Каких, к несчастью, много есть на свете.
Как будто из земли ты встала, мать,
Грозя фашизму, войны проклиная,
Чтоб Родину и жизнь оберегать,
И золото хлебов родного края.
Разбитый колокол… То жизнь оборвалась,
Которую вы прожили достойно.
Но нынче МИР берёт над миром власть,
И вы, родные, спите здесь спокойно.
Сюда и в зной, и осенью сырой,
Зимою вьюжной, соловьиным маем
Придет с поклоном партизан седой,
Цветы возложит пара молодая.
И будут в пионеры принимать
Здесь, где покоится земля святая,
И юность будет клятву здесь давать,
В ряды борцов за коммунизм вступая.
В историю войны, в печальный том,
Войдёт мемориал своей страницей…
…В молчании проглотим слёзный ком,
Оставив здесь сердец своих частицу.

**Марксіна Фабрычніна**

**Шунеўка**

Тут цішыня...
І толькі матылькі
Над дзьмухаўцамі,
Быццам бы сняжынкі,
І ў траве
Схаваліся сцяжынкі,
І росы ззяюць,
Быццам светлякі.
Тут цішыня...
І толькі салавей
Ажно зайшоўся
Да знямогі,
Тут скрыжаванне лёсу
І дарогі
Сюды сыходзяцца
І ўлетку,
І пад спеў завеі.
Тут цішыня...
А кроў у жылах стыне...
Тут Шунеўка –
Сястра Хатыні.

**Іван Лазука**

**Попел тут не стыне**

Я ўздрыгнуў, калі ўбачыў зарыва,
Здалося, Шунеўка ізноў гарыць.
Не, не пажар... Тут над ахвярамі
Звіняць званы і свецяць ліхтары.
Стаіць калодзеж сіратой нямою,
У траве ляжать падмуркі былых хат.
Кароў не гоняць дзеці з вадапою:
Тут спапяліў усё фашысцкі кат.
Калісь над борам уздымаўся ранак,
Жылі тут людзі, нібы сваякі,
Але бяда прыйшла на кожны ганак,
І не ўзвіліся з комінаў дымкі.
Фашыст дастаў спакойна цыгарэту,
З бязлітаснай усмешкай прыкурыў,
Заплакала апошняя кабета,
У калодзежы раздаўся моцны ўзрыў.
Ён доўга гуў дзіцячымі ўсхліпамі,
Уратаваць сябе ніхто не змог.
Шумеў пажар над векавымі ліпамі,

Агонь і дым нічога не збярог.
Тут сэрцаў боль і страшная пакута,
Як цяжка слухаць вечныя званы...
У кожнага ў душы заціяты смутак
Пра тых, што не вярнуліся з вайны.
Змахнуў слязу з вачэй пры ўспаміне,
Усё сцярпеў і вынес мой народ.
Як і ў Хатыні, попел тут не стыне,
Гарачы попел тых ваенных год.

**Яўген Лукашэвіч**

## Сястра Хатыні

На гэтым месцы Шунеўка тулілася да лесу,
Тут кожны яе жыхар чакаў канца вайны,
Каб Перамогі дзень сустрэць з вясёлай песняй,
Ды наляцелі карнікі, нібы каршуны.
Кідалі ў калодзеж яны дзяцей жывымі,
Хаты падпалілі, а потым ужо ўсіх
Сагналі ў хлеў стары і зажыва спалілі,
І голас кожнага ў тым агні заціх.
А ім бы сёння жыць ды жыць шчасліва,
Аднак не давялося да мірных дзён дажыць.
Як дань жыццю ўсіх тых, хто тут навек загінуў
Прыходзіць сюды кожны, каб кветкі палажыць.
На месцы кожнай хаты бетонны зруб стаіць,
Імёны высечаны на пліце з граніту,
І помнім мы ўсе – ніколі вас не забыць
І будзем помніць век – нішто тут не забыта.
Тут мірна і шчасліва людзі жыць маглі б,
Ад вёскі засталіся толькі адны ўспаміны.
Век будзе стаяць помнікам на Докшыцкай зямлі
Былая вёска Шунеўка – сястра Хатыні.
Чаму б цяпер не жыць нам мірна на планеце,
Каб боль не чуць Хатыні і Шунеўкі званы.
Што выпрабавалі мы – няхай не знаюць дзеці.
Зрабіць гатовы ўсё, каб не было вайны.

**Генадзь Кішулька**

## Поня

**1**

Непрыкметная рэчка Поня,
На лугах ружовыя коні,
У іх грывах вольны туман,
У вачах – блакітная поўня.
Хочаш не хочаш –

Увядуць у зман
Цыркачы лугавыя – конікі.
Так і слухаў бы іх да дня
Там, дзе сцеліцца цішыня.
Шалясцяць, звіняць снягі,
Я цалую твае берагі.
Твае хвалі цалую, Поня.
П’юць расу ружовыя коні.
І, прысвечаны шчасцем да дна,
Я з табою да золку – дня.
Па кустах чатырох старон
Салаўёў маладых маленства.
Гэты чысты, крыштальны звон –
Звон далёкі майго маленства.
Паўтаруся ж, крыштальны звон,
Мне да скону апошніх дзён.
Непрыкметная рэчка Поня,
Я шчаслівы с табой сягоння...

**2**

Я зноў к табе вярнуся, Поня.
Дапамагу ці не бядзе:
Ані затокі, ані гоні,
Ані лілеі на вадзе.
Тваё насельніцтва звялося.
Русалка – казачка сплыла.
Няма ранейшай весялосці,
Няма ранейшага святла.
На заліўных лугах, бывала ж,
Шумела – паспрабуй стрымай!
Усё наноснае змывала,
Сплаўляла аж за небакрай.
З табою рос я, рэчка Поня,
Бурштыну быў твон звон чысцей.
...Глядзіш самотна, як спакойна
Брод пераходзіць верабей.

**Эдуард Зубрыцкі**

## Балада пра дуб саўгаса “Сітца”

Шмат за жыццё дзівоснага
Бачыць мне выпадала,
Дрэваў самых магутных
Я наглядаў нямала.

Бачыў у пушчах дрымотных,
Каля азёраў, крыніцаў...
Чаму ж ты параніў сэрца,
Дуб, што з саўгаса “Сітца”?

Год мо пяцьсот ці болей.
Аж да аблокаў рушыш,
Крокаў аж дваццаць зробіш,
Пакуль ля камля абкружыш.
Галлё тваё, што крэмень,
Летам мядзяна-зялёны...
Ды на цябе як гляну,
Быццам ты чым засмучоны?..
І праўда, калі распазнаеш,
Хочацца слёзам ліцца,
Што мне пра дуб расказалі
Людзі з саўгаса “Сітца”.
Глянь жа ты ўвысь і добра,-
Вершаліна дуба свіціцца,
Бачыш зялёную крону,
Абскуб яе нехта быццам?
Што ж па галлі пахадзілі
Сякерамі, нават пілою –
Гэта было ў сорак першым,
Часінаю вельмі цяжкою.
Гэта было ў сорак першым,
У год невыносна-крывавы.
Эсэсаўцам, вырадкам лютым,
Бач, не хапала забавы,
Ну й рагаталі ж, як чэрці,
З выдумкі быццам заўзятай,
Сагналі музыкаў палонных
У робах сюды паласатых.
Што ім бяда музыкантаў.
Затое эсэсаўцам люба –
Ах, як іграў ім, іграў ім
Аркестр духавы на дубе!..
Былі сярод тых аркестрантаў
Савецкія, сербы, французы,
Бельгійцы, англійцы, ірландцы –
Ігралі вальсон і блюзы,
Ігралі ваўсю аркестранты,
Заказы ім з долу крычалі,
А ката ў мундзірах, спадніцах,
Скакалі, скакалі, скакалі...
Да сёмага поту скакалі,
Як толькі трымалі іх ногі,
Здавалася – неба ірвалі
Пра фюрэра “хайлі” і “гохі”...
І раптам яны анямелі
І знік звар’яцелы запал,
Ім вушы прарэзаў няшчадна,
Як гром, як нястрымны абвал,-
“Інтэрнацыянал”!..
Эсэсаўцы гаўкалі: - Стой!..
Але аркестранты не чулі –
Ігралі мацней і мацней...
І з долу пасыпалі кулі!
Ды марш пралетарскі байцоў
Ніякая смерць не заглушыць.
І падалі з голля тады
Нічым не скаронныя душы.
Ім бачыўся час перамог,
І горда яны паміралі,
А трубы і нават адны,
Здавалася, самі ігралі...

***

А мне ўсё гэта расказаў,
Ніколі аб тым не забыцца,
Волат наш, сведка жывы,
Дуб, што ў саўгасе “Сітца”!

**Пятрусь Броўка**

# Звесткі аб знакамітых земляках

## Барздыка Павел Фёдаравіч

У 1929 годзе 9 лютага ў в. Шклянцы нарадзіўся Павел Фёдаравіч Барздыка, беларускі мастак.

Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1956), Маскоўскі паліграфічны інстытут (1965). Працуе ў графіцы і кніжным афармленні. З 1956 у друкарні ім.Сталіна, з 1960 мастацкі рэдактар выдавецтва “Ураджай”, з 1967 на Мастацкім камбінаце. Лаўрэат рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і выставак “Мастацтва кнігі”.

## Барздыка Міхаіл Фёдаравіч

13 лістапада 1944 года ў в. Шклянцы нарадзіўся Міхаіл Фёдаравіч Барздыка, беларускі графік.

Скончыў БПІ (1973), выкладаў у ім. З 1975 супрацоўнічае з беларускімі выдавецтвамі. Творчасць адметная спалучэннем філасофскага разумення жыцця і лірычнай інтэрпрэтацыі (дыптых “Воблакі і камяні”, 1988; “Метамарфозы”, 1992; “Варыяцыі на тэму восені”, 1994; “Падабенства”, 1995 і інш.). На 22-м міжнародным салоне ў Бельгіі яго творы адзначаны сярэбраным медалём (1992) і залатым медалём Еўрапейскай АМ (1993).

## Зубрыцкі Эдуард Іосіфавіч

17 красавіка 1942 года ў в. Шклянцы нарадзіўся Эдуард Іосіфавіч Зубрыцкі, беларускі паэт, журналіст.

Скончыў БДУ (1968). Працаваў настаўнікам у Чашніцкім і Верхнядзвінскім раёнах. З 1971 года супрацоўнік рэдакцыі вернядзвінскай раённай газеты “Дзвінская праўда”.

Першыя вершы надрукаваў у 1960 ў часопісе “Маладосць”. З гэтага часу яго творы пачалі друкаваць ў часопісах “Полымя”, “Беларусь”, “Работніца і сялянка”, ў альманахах “Дзень паэзіі”, “Універсітэт паэтычны”, “Квадра”, “Віцебшчына літаратурная”і інш. аўтар аповесці “Суэма” (1968), паэмы “Жальба Сар’янскай пушчы” (1993). У 1975 выйшаў зборнік вершаў і паэм “Блакітныя казкі”.

## Кірвель Анатоль Мяфодзьевіч

23 ліпеня 1939 года ў в. Вітунічы нарадзіўся Анатоль Мяфодзьевіч Кірвель, беларускі пісьменнік, публіцыст, грамадска-культурны дзеяч.

Вучыўся ў Мінскім інстытуце замежных моў (1958-61), настаўнічаў. З 1977 года жыве ў Санкт-Пецярбургу. Друкуецца з 1969 года. Аўтар кніг апавяданняў “Човен Харона” (1993), вершаў і мініяцюр у прозе “Урбанія” (1994), “Чалавеку ўласціва…”, “Формула Замежжа” (1996), “Ласінае крэда” (1997), якія адметныя лаканізмам, філасафічнасцю, прытчавасцю.

### *Скараход Віктар Іванавіч*

4 студзеня 1924 года ў в. Слабада Бярозкаўскага сельскага савета нарадзіўся Віктар Іванавіч Скараход, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, краязнаўца.

У 1941 годзе скончыў Бярозкаўскую школу. З сакавіка 1943 года пайшоў у партызаны, быў стралком, кулямётчыкам, супрацоўнікам рэдакцыі падпольнай партызанскай газеты “Савецкі патрыёт”.У пасляваенныя гады настаўнічаў у Бярозкаўскай, Атрубацкай, Бярэзінскай школах раёна, пазней у СШ № 135 г. Мінска, СГПТВ № 63 г. Мінска.

Краязнаўчай дзейнасцю займаецца з 1952 года. Яго краязнаўчыя, літаратурна-публіцыстычныя, паэтычныя творы друкуюцца ў раённай газеце “Родныя вытокі”, у часопісах “Беларуская мінуўшчына”, “Маладосць”, “Полымя”.

### *Чарныш Аляксандр Іванавіч*

Чарныш Аляксандр Іванавіч, Герой Савецкага Саюза, нарадзіўся ў вёсцы Кромавічы Докшыцкага раёна 12 лютага 1917 года.

У 1935 годзе скончыў Мар’інагорскі сельскагаспадарчы тэхнікум. У Чырвонай Арміі з 1938 года. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі (1939), савецка-фінляндскай вайны (1939-40), Вялікай Айчыннай вайны. З 1941 года на Ленінградскім, Закаўказскім, Беларускім і 1-ым Беларускім франтах. Камандзір стралковай роты А.І Чарныш адзначыўся ў час Беларускай аперацыі. Рота пад яго камандваннем 28 чэрвеня1944 года ў г.п. Кіраўск Магілёўскай вобласці атакавала адступаючага ворага, знішчыла каля 170 і ўзяла ў палон 27 гітлераўцаў. 29 чэрвеня 1944 года байцы роты зайшлі ў тыл немцаў і адрэзалі шлях да адступлення па дарозе Бабруйск – Мінск, адбілі 14 контратак танкаў і пехоты, знішчылі і ўзялі ў палон 80 фашыстаў. У гэтым баю Чарныш загінуў. Пахаваны ў в. Чарніца Бабруйскага раёна. Яго імем названы вуліцы ў Бягомлі, Кіраўску, в. Калініна Бабруйскага раёна, КУСГП у Докшыцкім раёне.

### *Бабровіч Ян Станіслававіч*

Нарадзіўся 15 чэрвеня 1902 года ў вёсцы Параф’янава Докшыцкага раёна. З 1916 года Ян Бабровіч веставы і перапісчык папер у ваенна-дарожным атрадзе на Віленшчыне, з 1917 – наглядчык Мінскага тэлеграфа на лініі Ратамка – Мінск. З 1918 па 1920 гады вучыўся ў гімназіі і на рабфаку ў Вільні. У 1921 годзе працуе інспектарам школьнага ўпраўлення ў Мінску-Мазавецкім (Польшча). З 1922 па 1925 гады вучыўся ў Пражскім універсітэце. У 1923 годзе ўступіў у Камуністычную партыю Чэхаславакіі, а з 1926 года стаў членам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. З гэтага ж года знаходзіцца на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Кааптаваны ў ЦК КПЗБ, яго прадстаўнік пры ЦК Беларускай сялянска-работніцкай грамады і палітрэдактар газет БСРГ “Жыццё беларуса”, “Беларуская ніва”, “Беларуская справа”, “Народная справа”, “Наша справа” і інш. Яго партыйны

псеўданім – Борскі Казімір Іванавіч. З’яўляўся таксама кандыдатам у ЦК Камуністычнай партыі Польшчы.

23 снежня 1928 года арыштаваны і прыгавораны да 15 гадоў турмы. У выніку абмену палітычнымі вязнямі ў 1932 годзе трапіў у СССР. Працаваў у камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Акадэміі Навук БССР. Сааўтар з (Я. Багданскім) брашуры “Аб класавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай сялянска-работніцкай грамады” (1932). 18 кастрычніка 1933 года арыштаваны па справе “Беларускага нацыянальнага цэнтра”. 19 студзеня 1934 года паводле пастановы судовай калегіі АДПУ прыгавораны да 10 гадоў зняволення. Пакаранне адбываў на Далёкім Усходзе. 14 жніўня 1939 года Амурскім абласным судом асуджаны яшчэ на 10 гадоў пазбаўлення волі і накіраваны ў Северадзвінскі лагер (Архангельская вобласць), дзе і памёр 8 студзеня 1943 года. Рэабілітаваны 16 жніўня 1956 годзе.

### *Гмырак Лявон (сапр. Бабровіч Мечыслаў)*

Нарадзіўся 18 красавіка 1891 года ў вёсцы Параф’янава Докшыцкага раёна. Вучыўся ў 1-й Віленскай гімназіі. Скончыў прыватную тэхнічна-прамысловую школу ў Варшаве ў 1912 годзе. Прцаваў у Вільні і ў розных фальварках Віленскай губерні. Супрацоўнічаў з газетай “Наша ніва”, часопісам “Лучынка”, альманахам “Маладая Беларусь”. Аўтар апавядання “Васілёва вяселле” (1913), нарыса па гісторыі нацыянальна-культурнага руху “Беларускае нацыянальнае адраджэнне”, артыкулаў па гісторыі беларускай культуры, актуальных праблемах сацыяльна-палітычнага жыцця, артыкула “Тарас Шаўчэнка” і інш. выступаў за культурна-нацыянальную аўтаномію Беларусі ў саюзе з дэмакратычнымі сіламі Расіі. На гістарычныя погляды Гмырака паўплывалі праграма Беларускай сацыялістычнай грамады, сацыяльна-этычная канцэпцыя расійскага народніка П. Лаўрова пра абавязак інтэлігенцыі і элітарных сацыяльных груп сплачваць доўг народу. Лічыў, што скасаванне прыгону ў1861 годзе стала паваротным пунктам у гісторыі Беларусі: яно вызваліла народ ад “цялеснай няволі” і спарадзіла надзею на крах “духоўнай няволі” – вызваленне душы народа, яго мовы ад шматвяковага прыгону.

У 1914 годзе прызваны ў армію. Загінуў 13 ліпеня 1915 года на расійска-нямецкім фронце. Пасмяротна ўзнагароджаны Георгіеўскім крыжом.

### *Камінская Ірына Пятроўна*

Нарадзілася 22 студзеня 1933 года ў вёсцы Порплішча Докшыцкага раёна ў сялянскай сям’і.

З 1948 па 1957 год працавала свінаркай, а з 1957 па 1959 гады даяркай саўгаса “Сітцы”. 18 студзеня 1958 года І.П. Камінскай прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы за дасягненне высокіх паказчыкаў у вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі. У 1961 годзе перайшла працаваць свінаркай у саўгас “Порплішча”.

4 лістапада 1963 года Камінская І.П. загінула ў аўтамабільнай катастрофе. На мясцовых могілках пастаўлены абеліск.

### *Карповіч Мікалай Уладзіміравіч*

Нарадзіўся 16 верасня 1926 года ў в.Сітцы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

З 1952 рахункавод, з 1953 брыгадзір паляводчай брыгады саўгаса “Сітцы”. Званне Героя Сацыялістычнай працы прысвоена ў 1972 за павелічэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў 9-й пяцігодцы. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, “Знак Пашаны” (1966).

Памёр 8 студзеня 1992 года.

## *Архітэктурныя помнікі*

### *Спаса-Праабражэнская царква* **(в. Порплішча)**

Помнік драўлянага дойлідства 1-й паловы XVII стагоддзя. Пабудавана ў 1627 годзе, перабудавана ў 1794 годзе з элементамі класіцызму. Крыжова-купальны храм з планам у выглядзе лацінскага крыжа. Зрубы накрыты ўзаемна перпендыкулярнымі 2-схільнымі дахамі. Над сяродкрыжжам масіўны 8-гранны светлавы барабан, завершаны гранёным купалам з галоўкай. Абапал 5-граннага алтарнага зруба невялікія прамавугольныя ў плане рызніцы. У 1883 годзе да галоўнага фасада прыбудавана 3-ярусная вежа-званіца з бабінцам у ніжнім ярусе, накрытая невысокім 4-схільным шатром.

### *Касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі* **(в. Парафьянава)**

Пабудаваны ў 1908 годзе з цэглы. Помнік архітэктуры неабарока. 3-нефавая 2-вежавая базіліка з трансептам. З усходняга боку завяршаецца паўцыркульнай апсідай з абходнай галерэяй і 2 сакрысціямі. Галоўны заходні фасад вылучаюць 2 шмат’ярусныя вежы. Паміж – фігурны шчыт, такі ж і над дахам апсіды. Тарцы трансепта завершаны 3-вугольнымі франтонамі. У дэкаратыўнай аздобе фасадаў, прарэзаных паўцыркульнымі аконнымі праёмамі, выкарыстаны пілястры, шырокія прафіляваныя карнізы, люкарны.

У інтэр’еры 8 слупоў падзяляюць прастору залы на 3 нефы. Цэнтральны неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем, бакавыя – крыжовымі. Слупы і сцены дэкарыраваны здвоенымі пілястрамі, упрыгожаны арнаментальным роспісам і 12 гіпсавымі гарэльефамі “Крыжовы шлях Хрыста” (1927). Алтар дэкарыраваны гіпсавымі выявамі святых.

***Свята-Георгіеўская царква*** **(в. Сітцы)**

Пабудавана ў 1913 годзе з цэглы на месцы папярэдняга храма.

Помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю. Належыць да тыпу крыжова-купальных храмаў са званіцай. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя мае вертыкальную накіраванасць, якая ствараецца дамінантамі 3-яруснай шатровай васьмерыковай званіцы і цыліндрычнага светлавога барабана з цыбулепадобным купалам. Архітэктурны дэкор уключае какошнікі, аркатуру, лапаткі, ліштвы арачных аконных праёмаў.

У інтэр'еры ветразі барабана размаляваны выявамі евангелістаў, барабан – апосталаў на небасхіле. Абраз – фератрон "Маці Божая з дзіцем" і "Іосіф з дзіцем" (канец XVIII стагоддзя).

***Касцёл Маці Божай*** **(в. Порплішча)**

Помнік драўлянага дойлідства. Пабудаваны ў 1937-41гг. мясцовымі майстрамі пад кіраўніцтвам Б.Шантара. У 1950 вежа зачыненага касцёла была знята, будынак прыстасаваны пад Докшыцкую школу механізацыі, пазней, да 1990 ў ім размяшчалася жыллё і сховішча. У 1991-93 намаганямі вернікаў адноўлены. Вархітэктанічная кампазіцыя касцёла складаецца з выцягнутага прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму, накрытага высокім двухсхільным дахам, прамавугольнай алтарнай часткі з сіметрычнымі сакрысціямі на баках, накрытымі больш нізкімі дахамі, і шмат'яруснай чацверыкавай вежы на галоўным фасадзе. Унутраная прастора храма падзелена апорнымі слупамі на 3 нефы з бэлечнымі перакрыццямі. З боку ўвахода ўнутры асноўнага аб'ёму вылучаны нартэкс з арганнымі хорамі. Ніжні чацвярык вежы часткова выступае на галоўным фасадзе, ствараючы крыты ганак (экзанартэкс). Верхні ярус вежы і сігнатурка, якая прарэзвае вільчык даху каля алтара, накрыты традыцыйнымі чатырохсхільнымі шатрамі-"каўпакамі" са злёгку выгнутымі схіламі, што надае форме пакрыцця вытанчанасць. Сцены звонку гарызантальна ашаляваны і ўмацаваны вертыкальнымі сцяжкамі. Архітэктурнае вырашэнне святыні ўдала працягвае традыцыі драўлянага касцельнага дойлідства Беларусі.

***Брама*** **(в. Сітцы)**

Пабудавана ў пачатку XVIII стагоддзя з цэглы.

Кампазіцыя брамы сіметрычная, ступеньчатая, трох'ярусная. Першы ярус – масіўная трохпралётная арка з вялікім цэнтральным праёмам. Другі ярус (падваротны) утвораны прамавугольным у плане аб'ёмам. Унутр аб'ёму вядуць 2 вінтавыя лесвіцы, якія размешчаны ў цэнтральных пілонах аркі. Надваротнае памяшканне мае цыліндрычнае скляпенне. Браму завяршае невялікая вежа з купалам. У падваротнай частцы брамы і ў вежы знаходзіўся драўляны механізм гадзінніка з "зязюляй", зроблены мясцовым майстрам.

Брама – прыклад архітэктуры малых форм беларускага барока.

# *Літаратура*


1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1996-2003.
2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць – Мінск: Бел. Сав. Энцыклапедыя, 1985. – С.242 – 258.
3. Их именами названы…: Энциклопедический справочник. – Мінск: БелСЭ, 1987. – 711 с.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993-2003.
5. Газета “Родныя вытокі”. – 2008 – 2012.
6. Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік /А.М. Кулагін – Мінск: БелЭн, 2000.
7. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / А.М.Кулагін – Мінск: БелЭн, 2001. – 328 с.
8. Легенды і паданні Докшыцкага краю. – Докшыцы, ЦДТ, 2001. – 68 с.
9. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Докшыцкага раёна: рэд.кал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭН, 2004. – 752 с.
10. Шуневка. Мінск: Беларусь, 1985. – 32 с.


# *Інфармацыйны рэсурс*


1. http://dokshitsy.vitebsk-region.gov.by/ru/
2. https://ru.wikipedia.org/wiki/%C4%EE%EA%F8%E8%F6%EA%E8%E9_%F0%E0%E9%EE%ED
3. http://www.radzima.org/ru/photos_/dokshitskiy.html
4. http://www.radzima.net/ru/rayon/dokshycki.html
5. http://globus.tut.by/_regs/dokshic_tn.htm
6. http://westki.info/artykuly/11761/doksickiy-rayon-bielarus-doksicy-krulievshchina-biehoml-parafianovo-novosti-doksic